**Урок беларускай мовы ў 5 класе “Прамое і пераноснае значэнне слова”**

Мэта: стварыць умовы для засваення вучнямі тэмы “Прамое і пераноснае значэнне слова

Задачы:

1. Даць паняцце аб прамым і пераносным значэнні слова;
2. Сфарміраваць уменне адрозніваць прамое і пераноснае значэнні слоў, уменне знаходзіць у тэксце словы з пераносным значэннем і ўжываць іх у мове; фарміраваць навыкі работы з тлумачальным слоўнікам, абагачаць слоўнікавы запас вучняў
3. Выхоўваць чалавечныя, добрыя адносіны да маці, развіваць непрымірымасць да няпраўды, зла, зневажання чалавечай годнасці

Абсталяванне: падручнік « Беларуская мова” для 5 класа, частка 2, В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль, 2014; тэкст верша, легенда, тлумачальны слоўнік беларускай мовы, прэзентацыя, праграма MyTest

**Ход урока**

1. Арганізацыйны момант

   Гульня “Падаруй усмешку”

   - Добры дзень, дзеці. Павітайцеся, калі ласка, вачамі, усміхніцеся адзін аднаму. Падаруем адзін аднаму ўсмешку і ў нас на працягу ўрока будзе добры настрой.

2. Праца па тэме

   - Успомнім, аб чым мы гаварылі на папярэдніх уроках

(Прыблізныя адказы дзяцей: вывучалі лексіку, значэнні слоў, лексічнае і граматычнае значэнні, адназначныя і мнагазначныя словы і г.д.)

- Якія прымаўкі ведаеце аб слове? Прачытайце (Праверка дамашняга задання)
- Растлумачце прымаўку: “Ласкавае слова як вясенні дзень” (Добрае, ласкавае слова можа растапіць, сагрэць душу, дапамагчы чалавеку)

Слайд 2

Словы бываюць розныя,
Словы бываюць усякія,
Словы бываюць ясныя,
Цвёрдыя і мяккія… (С. Баруздзін)

Слайд 3

Словам можна забіць, словам можна выратаваць… (В. Шэфнер)

- Як вы разумееце гэтыя выказванні?

  (Адказы вучняў)
- Словам можна пакрыўдзіць чалавека, абразіць, напрыклад, як гэта зрабіў Хлопчык-зорка з казкі О.Уальда. Якія крыўдныя словы сказаў ён сваёй маці?
- Ён сказаў сваёй роднай маці такія словы, што потым яму прыйшлося

  выпрабаваць шмат нягод, каб знайсці сваю маці і папрасіць у яе выбачэння. Як вы думаеце, якія якасці прыйшлося развіць хлопчыку, што так неабдумна пакрыўдзіў сваю маці? (сардэчнасць, дабрату, чалавечнасць, гуманнасць, клапатлівасць, спагадлівасць, чуласць)

- Знайдзіце, калі ласка, у "Тлумачальным слоўніку" значэнні слоў "спагадлівасць", "чуласць".
- Сёння мы будзем працягваць вывучэнне раздзела "Лексіка", і хацелася б пагаварыць аб самым дарагім чалавеку на свеце. Для кожнага з нас гэта … маці, і я назвала б наш урок "Залатая маці" . Тэма-загадка?

  Раскрыць гэту тэму і сфармуляваць мэту і задачы ўрока дапаможа верш "Залатая маці".

  Слайд 4.

  У маці сэрца залатое  
  І залатая галава,  
  У маці рукі залатыя,  
  І справы ладзяцца здаўна  
  І тата маці называе:
- Ты чалавек наш залаты!

  Сястрычка толькі ўздыхае:
- Дык золата – метал такі,  
  Пярсцёнак, праўда, ёсць на пальцы,  
  Ды рукі толькі не блішчаць,  
  А ля вачэй ужо маршчынкі,  
  Не залатыя – штучак пяць…  
  Няма на сэрцы залатога,  
  А сэрца … дык яно ўнутры,  
  І ў грудзях матулі б'ецца,  
  Ты толькі пробу разглядзі!

  - Колькі разоў сустракаецца слова "залаты" ў тэксце? (6)
  - Сфармулюйце лексічнае значэнне слова "залаты" ў кожным выпадку

( залатая маці – добрая маці; залатое сэрца – чалавечнае, добрае, чулае сэрца; залатая галава – разумная галава; залатыя рукі – умелыя рукі; залаты чалавек – добры, чулы чалавек)

- Што вы можаце сказаць пра слова “залаты”? Якое гэта слова? Што агульнага паміж усімі словамі? (“Залаты” – мнагазначнае слова)
- Загляніце, калі ласка, у “Тлумачальны слоўнік”, даведаемся, колькі значэнняў мае гэта слова, зачытаем іх

Слайд 5.

Залаты – 1.

**1.** Які складаецца з золата, з'яўляецца золатам. Залаты самародак. Залаты пясок. // Зроблены з золата. Залаты пярсцёнак. // Вытканы, вышыты пазалочанымі ніткамі. Залатыя пагоны. // Які вылічаецца на золата, па курсу золата. Залаты размен. Залатая валюта.

2. У значэнні назоўнік: залаты, -ога, мужчынскі род, устарэлае слова, устарэлы выраз: Залатая манета; чырвонец.

**3.** Бліскуча-жоўты, падобны колерам да золата. На неба ўсходзіў месяц залаты. *Купала.* Залатыя промні працягнуліся праз вокны і ў Паходнеў пакой. *Хадкевіч.*

**4.** Пераноснае значэнне. Надта добры па сваіх якасцях; цудоўны, выдатны. Залаты характар. Залатыя словы. ▪ «Які мілы і залаты хлопец, — падумала.. [Магдалена]. — Як ён завіхаецца каля машыны і які рухавы». *Чорны.*

**5.** Пераноснае значэнне: Шчаслівы, радасны. Залаты час. Залатое дзяцінства. ▪ Маладая вясна, залатая пара! Будзь красна і ясна, Не шкадуй нам дабра! *Колас.*

**6.** Пераноснае значэнне: Дарагі, любімы. Залатыя мае дзеткі.

**7.** Як састаўная частка некаторых батанічных і заалагічных назваў: Залатое дрэва. Залатая рыбка.

- У рускім слоўніку С.І. Ожэгава

Золотой – 1. Цвета золота, блестяще-желтый. *Золотая осень.* 2. *перен.* Счастливый, благоприятный. *Золотая пора.* 3. *перен.* Прекрасный, замечательный. *Золотые руки.* 4. *перен.* Дорогой, любимый. *Золотой мой!*

- Колькі значэнняў мае слова "залаты"? Якое з іх асноўнае? З якімі з гэтых значэнняў мы сустрэліся ў вершы "Залатая маці"?

- Хацелася б звярнуць вашу ўвагу на значэнні слова з паметкай *перан.*

- Такім чынам, аб чым пойдзе гутарка на ўроку?

3. ***Запіс тэмы "Прамое і пераноснае значэнне слова"***
   - Якое значэнне слова называецца прамым? Назавіце прамое значэнне слова "залаты"
   - Чаму іншыя значэнні з'яўляюцца пераноснымі і чаму яны называюцца пераноснымі?
   - Заглянем у падручнік і папрацуем з правілам на старонцы 54-55
   - На аснове чаго адбыўся перанос значэння слова ў словазлучэнні "залатая маці", т.е. чаму мы даём такое вызначэнне маці?

     (на аснове высокай якасці металу – золата. Залатая маці – танная, дарагая)
   - Які вынік можам зрабіць?

     ( Мнагазначныя словы могуць мець прамое і пераноснае значэнні)

**4. Замацаванне тэмы**

Слайд 6.

*Заданні:* Са слоў, дадзеных у дужках, выбраць такія, у спалучэнні з якімі прыметнікі атрымаюць пераноснае значэнне.

Бірузовы (брошка, неба, пярсцёнак); залаты (пярсцёнак, рукі, каласы); жамчужны (каралі, зубы, завушніцы); запаліць (свечка, вогнішча, дровы, хлопцы); рассыпаліся (збожжа, манеты, прамяні, зоркі.)

(*Праца ў сшытках. Праверка па ключы . Слайд 7)

- Прывядзіце свае прыклады (чэрствы хлеб – чэрствае сэрца, жалезны характар – жалезны трактар і г.д.)

Слайд 8. Запішыце словазлучэнні, размяркоўваючы ў 2 слупкі:

1) з прамым значэннем; 2) з пераносным значэннем:

   Жар сонца – жар пачуццяў, цяжар багажу – цяжар страты, гнуткасць розуму – гнуткасць галінкі, каменны будынак – каменнае сэрца, спелы ўзрост – спелы плод, малоць зерне – малоць глупства, будаваць планы – будаваць мост, захоўваць каштоўнасці – захоўваць маўчанне.

(*Праца ў сшытках. Праверка па ключы . Слайд 9)

Слайд 10. Хвілінка для адпачынку (серыя “Электронныя фізхвілінкі для вачэй” № 11)

Слайд 11.

- Перад вамі тэкст. Уважліва прачытайце

Легенда.

Быў у маці адзіны сын. Ажаніўся ён з дзяўчынай-прыгажуняй. Але сэрца ў маладой жанчыны было

чорнае, а характар цяжкі. Гаворыць яна мужу: “Перасялі маці ў хлеў, няхай больш не ходзіць у хату”. Баялася маці халодных вачэй нявесткі. Толькі ноччу выходзіла яна з цёмнага хлеўчука. Але гэтага было мала прыгажуні. Вось яна і кажа мужу: “Калі не хочаш страціць мяне, вынімі з грудзей маці сэрца і прынясі яго мне.” Не ўздрыганулася сэрца сыноўняе, зачаравала яго прыгажосць жонкі.Сын павёў маці да ракі і забіў яе. Пайшоў назад, а сэрца паклаў на далоні. Спатыкнуўся ён аб камень, упаў, стукнуўся. А гарачае акрываўленае сэрца ўпала і прашаптала: “Сыночак залаценькі, ці не баліць табе? Прысядзь, адпачні!”

(В.А. Сухамлінскі)

Падкрэсленыя словы настаўнік тлумачыць.

- Падкрэсліце (можна выпісаць) ў тэксце словазлучэнні з пераносным значэннем. Як яны характарыхуюць герояў?
- Падбярыце да знойдзеных слоў прыклады з прамым значэннем
- Над кожным словазлучэннем пастаўце лічбу, адпаведную пераходу значэння на аснове падабенства: 1) колеру; 2) вагі; 3) цяпла; 4) высокай якасці металу; 5) дзеянням людзей прыпісваюцца нежывыя прадметы.

    (1)асляпляльная прыгажосць, чорнае сэрца; 2) цяжкі характар; 3) халодныя вочы, гарачае сэрца; 4) залаты сыночак; 5) страціць мяне, зачаравала прыгажосць.)

- Зараз я прапаную вам прыдумаць працяг легенды. Напішыце 2-3 сказы, ужываючы словы з пераносным значэннем. (Некалькі вучняў зачытваюць свае варыянты заканчэння гэтай гісторыі).

- Я думаю, што вам хочацца даведацца, чым скончылася легенда. Слайд 12

Працяг легенды

З вачэй сына пакаціліся слёзы, закружылася галава. Паклаў ён сэрца назад, абліў яго гарачымі слязамі. Зразумеў ён, што ніхто і ніколі не любіў яго так аддана і бескарысліва, як родная маці. І настолькі вялізнай і невычэрпнай была любоў маці, настолькі глыбокім і моцным было жаданне сэрца маці бачыць сына радасным і шчаслівым, што ажыло сэрца, закрыліся разадраныя грудзі, устала маці і прыціснула кучаравую галаву сына да грудзей.

Не захацеў пасля гэтага сын вяртацца да жонкі, бо ў грудзях яе білася каменнае сэрца. Не вярнулася і маці.

**5. Кантроль ведаў.**

Выкананне тэста ў праграме MyTest:

1. Укажыце прамое значэнне слова “удар”:
   1) Цяжкае ўзрушэнне
   2) Штуршок
2. Укажыце прамое значэнне слова “разбіць”:
   1) Раскалоць на кавалкі
   2) Знічшыць
3. Укажыце пераноснае значэнне слова “цёплы”:
   1) Злёгку нагрэты
   2) Сардэчны, ласкавы
4. Якія словазлучэнні ўжыты ў пераносным значэнні?
   1) Снежны дыван
   2) Турэцкі дыван
   3) Воўчы след

4) Воўчы апетыт

5. Якое словазлучэнне лішняе?
    1) Шырокая вуліца
    2) Залаты характар
    3) Стальны нож
    4) Кучаравыя валасы
    5) Ледзяная глыба
6. Якое словазлучэнне лішняе (улічваючы значэнне залежнага слова)?
    1) Глыбокія веды
    2) Востры язычок
    3) Салодкі кісель
    4) Грубая памылка
    5) Цёмны чалавек

6. **Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія**.

- Ці адказалі мы на пытанні, якія паставілі ў пачатку ўрока?
- Сфармулюйце вывучаныя азначэнні
- Дзе мы можам прымяніць атрыманыя веды? Навошта патрэбны пераносныя значэнні слоў? (Пераносныя значэнні – сродкі выразнасці. Яны робяць тэкст жывым, выразным, красамоўным)
- Якая галоўная тэма легенды В.А. Сухамлінскага? Чаму яна нас вучыць? (Знешняя прыгажосць, як у жонкі-прыгажуні, часам нічога не значыць. Мы мяркуем пра чалавека па справах і ўчынках. Нельга здраджваць блізкім. Сэрца маці ўсё даруе. Самае страшнае для чалавека – глядзець і не бачыць зла (як сын), прывыкаць да зла або дапамагаць гэта

зло тварыць. Не дапускайце прыніжэння чалавечай годнасці!)

- Хацелася б, каб вы былі добрымі, чалавечнымі, адгукваліся на чужы боль, каб вашы сэрцы ніколі не сталі каменнымі!

7. **Дамашняе заданне: с. 54-55, параграф 15, пр. 108**